**Алена Філатава,**
**Валянціна Яноўская**

# Рэгуляванне міжканфесійных адносін у заходніх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)

З приєднанням земель Великого князівства Литовського і Правобережної України, характерною рисою яких була поліконфесійність, уряд Російської імперії почав створювати законодавчу базу для регулювання відносин між різними конфесіями цих територій. Вироблення системи законодавчих заходів щодо регулювання міжконфесійних відносин упродовж усього періоду базувалось на державних пріоритетах: а) збереження панівного становища православної церкви; б) обмеження духовної діяльності неправославних конфесій.

*Ключові слова:* Російська імперія, західні губернії, міжконфесійні відносини, законодавча база

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ўрад Расійскай імперыі сутыкнуўся са складанымі ўзаемаадносінамі паміж канфесіямі гэтай тэрыторыі. Яны патрабавалі пастаяннага ўмяшальніцтва на вышэйшым узроўні і адпаведных заканадаўчых актаў.

У гістарыяграфіі дасавецкага часу пры разглядзе праблемы міжканфесійных адносінаў дамініравалі ўзаемаадносіны дзвюх хрысціянскіх канфесій – праваслаўнай і каталіцкай. Скрозь прызму гэтых адносінаў паказваліся і ўзаемадачыненні з уніяцкай царквой. Традыцыйны канцэптуальны падыход гісторыкаў царквы XIX ст., як правіла, абгрунтоўваў афіцыйны курс канфесійнай палітыкі Расійскай імперыі – на замацаванне пазіцый праваслаўнай царквы на далучаных землях, у тым ліку і за кошт іншых хрысціянскіх канфесій. У апошнія гады пытанне міжканфесійных адносін пачынае даследавацца як самастойная навуковая праблема[1]. У той ці іншай ступені да праблемы міжканфесійных адносін звярталіся даследчыкі і ў асобных працах па канфесійнай гісторыі. Але да гэтага часу не паказана станаўленне і эвалюцыя прававога механізма па рэгуляванні міжканфесійных адносін на працягу ўсяго перыяду знаходжання былых зямель ВКЛ у складзе Расійскай імперыі.

У якасці ключавых момантаў для аналізу вылучаны праблемы: а) рэгуляванне міжканфесійных пераходаў (што тычылася галоўным чынам хрысціянскіх канфесій); б) уключэнне ў заканадаўчую прастору дзяржавы “змешаных” шлюбаў, што суправаджалася і абцяжарвалася ломкай традыйных уяўленняў; в) дыялог *хрысціянства – іўдаізм*, які абвастраўся не толькі рознасцю ў менталітэ-

це і культуры, але і наяўнасцю межы аседласці. Для аналізу выкарыстаны архіўны матэрыял, які тычыцца галоўным чынам тэрыторыі Беларусі, але даная прававая база распрацоўвалася для ўсіх новадалучаных зямель.

*Рэгуляванне міжканфесійных пераходаў.* Вастрыня праблемы рэгулявання міжканканфесійных пераходаў канцэнтравалася галоўным чынам у межах хрысціянскай царквы. Гэта тлумачылася, з аднаго боку, пануючым становішчам праваслаўнай канфесіі, з іншага – размеркаваннем асноўнай масы насельніцтва беларускіх зямель менавіта паміж living рознымі хрысціянскімі канфесіямі. Ужо першыя дзесяцігоддзі паказалі ўсю складанасць адносінаў паміж хрысціянскімі канфесіямі і неабходнасць выпрацоўкі прававога іх рэгулявання на дзяржаўным узроўні. Так, у 1780–1795 гг. адбыліся масавыя пераходы/пераводы ўніятаў у праваслаўную веру. Супраціўленне, з якім сутыкнуліся праваслаўныя місіі, прадэманстравалі ўсю складанасць дадзенай праблемы.

Непаслядоўная канфесійная палітыка Паўла I не толькі не садзейнічала вырашэнню гэтай складанай праблемы, а хутчэй абвастрала сітуацыю. 18 сакавіка 1797 г. Павел I выдаў маніфест “О нестеснении свободы тем, кои от других исповеданий к православной церкви присоединиться пожелают”[2]. А ўжо ў 1798 г. выдаецца сакрэтны рэскрыпт, накіраваны супраць прымушэння ўніятаў да прыняцця “греческой веры”[3]. Сітуацыю скарыстала рымска-каталіцкая царква, распачаўшы новы віток пераходаў на сваю карысць. Ды і сама ўніяцкая царква не заставалася ў баку ад канфесійных спрэчак. З канца XVIII ст. яна распачала актыўную місіянерскую дзейнасць па вяртанні сваіх былых вернікаў, што спарадзіла скаргі праваслаўных іерархаў у Св. Сінод. І хаця ўказам Паўла I ад 28 жніўня 1797 г. уніяцкім святарам было забаронена праводзіць агітацыю сярод праваслаўнага насельніцтва аб пераходзе або аб вяртанні яго да ўніі, аж да 1839 г. Мінская праваслаўная духоўная кансісторыя разглядала скаргі аб пераходах/вяртанні праваслаўных ва ўніяцтва[4].

Каб прыпыніць ціск рымска-каталіцкай канфесіі на ўніяцкую ўрад быў вымушаны прымаць меры на карысць уніяцкай канфесіі. 25 кастрычніка 1807 г. былі пацверджаны ўсе ўказы, накіраваныя на зберажэнне цэласнасці ўніяцкай царквы[5]. 8 жніўня 1810 г. быў выдадзены ўказ Сената аб тэрміне даўніны для тых, хто пакінуў уніяцтва – 1798 г.

Пачынаючы з канца 1820-х гг. царскі урад і вышэйшае праваслаўнае духавенства пачалі разглядаць уніятаў, як былых праваслаўных, якіх неабходна было вяртаць у лона праваслаўнай царквы. Вынікам стала скасаванне ўніяцкай царквы і далучэнне яе вернікаў да праваслаўнай. Але амаль два дзесяцігоддзі цягнулася “разборка” былых уніятаў паміж каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі. Аказваючы ў шэрагу выпадкаў пасіўнае супраціўленне ўладам, былыя ўніяты пераходзілі ў каталіцтва. Адказнасць за такія пераходы ўскладвалася на

каталіцкае духавенства, якому забаранялася праводзіць агітацыю сярод былых уніятаў, прымаць іх да споведзі.

Масавы перавод уніяцкіх вернікаў у праваслаўе не стаў падставай дэманстрацыі іх моцы і адданасці праваслаўнай веры. На працягу наступных дзесяцігоддзяў многія з іх час ад часу ў знак пратэсту дэманстравалі свой намер перайсці ў рыма-каталіцтва. Але закон катэгарычна забараняў пераходы з праваслаўя ў любое іншае хрысціянскае веравызнанне. За спакушэнне з праваслаўя ў іншае хрысціянскае веравызнанне законы прадугледжвалі пазбаўленне ўсіх асобых правоў і прывілеяў, адпраўку ў ссылку. Тых, хто не быў вызвалены ад цялесных пакаранняў, каралі розгамі і аддавалі ў арыштанцкія роты тэрмінам на 1–2 гады. У выпадку прымянення насілля пры спакушэнні з праваслаўя віноўныя пазбаўляліся ўсіх правоў і маёмасці і высылаліся ў Сібір на пасяленне[6].

Як правіла, кожны пераход з праваслаўнай веры ў іншую разглядаўся судом. Нават самая нязначная справа аб пераходах, якія ўскосна тычыліся праваслаўя, вырашалася на яго карысць. Напрыклад, 28 мая 1845 г. дэпартамент замежных веравызнанняў Міністэрства ўнутраных спраў выказаўся супраць вяртання Віленскай каталіцкай кансісторыяй дзвюх стараверак (былых каталічак) на той падставе, што ”так называемые старообрядцы, не составляют особенного исповедания, а по происхождению своему принадлежат к господствующей православной церкви”[7].

Паказальнымі ў накірунку выніковасці ўрадавай палітыкі па пераводу вернікаў іншых хрысціянскіх канфесій у праваслаўе сталі гады пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Усяго за некалькі гадоў у цэлым па Расійскай імперыі праваслаўнымі сталі больш за 80 тыс. католікаў. Большая частка гэтых пераходаў прыходзілася на Літоўскую (ахоплівала тэрыторыю Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў) і Мінскую (адпавядала тэрыторыі Мінскай губерні) епархіі – адпаведна 30 і 37 тыс. чалавек[8].

Многіх пераводзілі ў праваслаўе прымусова, шляхам шантажу і падману. У далейшым сяляне падавалі калектыўныя скаргі з просьбай вярнуць іх у каталіцкую веру. Здараліся і даволі моцныя хваляванні, якія нават вымушалі ўлады ўводзіць войскі. У знак пратэсту вернікі адмаўляліся хадзіць на споведзь да праваслаўных святароў, упарта не жадалі хрысціць сваіх дзяцей у праваслаўнай царкве і наогул выконваць абрады праваслаўнай царквы.

Калі ж пераходы не тычыліся праваслаўнай царквы, то яны заканадаўча не забараняліся. Праўда, гэта было датычна толькі пераходаў паміж хрысціянскімі канфесіямі. За спробу перайсці з любога хрысціянскага ў нехрысціянскае веравызнанне па заканадаўству Расійскай імперыі пазбаўлялі ўсіх правоў і стану і накіроўвалі на катаржныя работы ад 8 да 10 гадоў[9].

Спрэчныя моманты па заканадаўчым рэгуляванні ўзаемадачыненняў хрысціянскіх канфесій, што не належалі да праваслаўя, пачалі ўзнікаць у

канцы XIX – пачатку XX ст. у сувязі з распаўсюджваннем сярод насельніцтва пратэстанцкага сектанцтва. Гэта быў новы, яшчэ невядомы аспект узаемаадносінаў, што іншым часам і скарыстоўвалі духоўныя асобы ў сваіх мэтах. Так, у красавіку 1903 г. у віцебскае губернскае праўленне паступіла калектыўная скарга ад 22 сямей баптысцкага веравызнання (Дзвінскі павет). Яны скардзіліся на валасное праўленне, якое адмаўлялася весці метрычныя кнігі на іх (запісы аб нарадзіўшыхся, заключэнні шлюбаў, памерлых). У адказе віцебскага губернатара гаварылася: "ходатайство о ведении … метрических книг… не подлежит удовлетворению ввиду того, что просители официально числятся лютеранами и в баптизм перешли без разрешения господина министра внутренних дел, как это требуется ст. 82 Уст. о пред. и прес. прест. Т. XIV изд. 1890 года"[10].

Прапаведнік баптыстаў Янсан выразіў нязгоду з рашэннем губернатара, сцвярджаючы, што "баптизм не есть особое исповедание, совершенно отличное от лютеранского"[11], адпаведна пераход з лютэранства ў баптызм не з'яўляецца пераходам з аднаго веравызнання ў другое і не патрабуе дазволу міністра, а метрычныя кнігі павінны весціся на падставе інструкцыі ад 15 жніўня 1879 г. Згодна з ёй, вядзенне метрычных кніг баптыстаў, што пражывалі ў Віцебскай губерні, ускладвалася на валасныя праўленни[12].

Рух з нехрысціянскіх веравызнанняў у хрысціянскія дазваляўся законамі Расійскай імперыі. 11 лютага 1842 г. быў прыняты ўказ Сената аб правілах пераходаў яўрэяў у хрысціянскую веру. Правілы сцвярджалі наступнае: 1) пры прыняцці хрысціянскай веры яўрэямі хрысціліся і іх малалетнія дзеці да 7 гадоў (калі ж веру прымаў толькі бацька, то хрысцілі сыноў; маці – дачок); 2) тых яўрэяў, якія прынялі хрысціянства і ўступілі ў духоўнае званне, выключалі з падатнага стану, у якім яны раней знаходзіліся; 3) дарослым яўрэям, якія перайшлі ў праваслаўе, выдавалася дапамога ад 15 да 30 тыс. руб. срэбрам, дзецям – палова сумы; 4) ахрышчаныя яўрэі пасля абвяшчэння капіталу прымалася ў гільдзейскае купецтва, астатнія – прыпісваліся (без папярэдняй згоды) да земляробскага, мяшчанскага або рамеснага грамадстваў[13].

Гэтыя правілы, як бачна, накіраваны былі на эканамічнае заахвочванне іўдзеяў да прыняцця аднаго з хрысціянскіх веравызнанняў. Але акрамя іх існаваў шэраг іншых, больш дробных, умоў пераходаў з іўдаізму непасрэдна ў праваслаўе. Гэтыя ўмовы распрацоўваліся і прымаліся Св. Сінодам. Так, па ўмовах сінодскіх указаў ад 17 студзеня 1831 г. і 17 сакавіка 1842 г. прашэнні ад яўрэяў аб хрышчэнні маглі быць пададзены ў пісьмовым выглядзе: а) імі асабіста; б) сведкамі мясцовага губернскага начальства, або якой-небудзь установы, дзе іх (іўдзеяў) ведалі. У якасці абавязковай умовы было прадугледжана папярэдняе навучанне асновам новай веры і правядзенне таінства хрышчэння "в Воскрестный или в праздничный день со всевозможною публич-

ностью"[14]. Менавіта гэтыя, на першы погляд, дробязі і парушаліся яўрэямі пры змене веравызнання. Па-першае, далёка не кожны яўрэй у душы станавіўся праваслаўным. Усё ж такі пераважалі імкненні сацыяльна-эканамічнага характару. Таму і вывучаць асновы праваслаўнай веры яны не спяшаліся. Яшчэ больш ім не падабалася ўмова хрысціцца публічна, бо іх былыя аднаверцы ставіліся даволі непрыхільна да тых, хто прыняў праваслаўе.

Зрэдку, але адбываліся пераходы ў хрысціянства з боку мусульманскіх вернікаў. Як правіла, для гэтага патрабаваўся дазвол міністра ўнутраных спраў.

Законы час ад часу парушаліся, што ўскладняла рэгуляванне міжканфесійных адносін. Праяўлялася гэта ў першую чаргу на ўзроўні ўзаемаадносінаў паміж святарамі розных хрысціянскіх канфесій. Разам з тым і ўрадавыя структуры (як на вышэйшым дзяржаўным, так і на мясцовым узроўнях) час ад часу скарыстоўвалі гэтую няпростую сітуацыю, каб праз узаемаадносіны святароў аказаць уплыў на вернікаў. Асабліва выразна праяўлялася супрацьстаянне духавенства пад час ваенна-палітычных канфліктаў, услед за якімі, як правіла, актывізаваліся пераходы праваслаўе/каталіцтва ў той, ці іншы бок, або ў іншыя канфесіі. Спроба ўрэгуляваць дадзеную сітуацыю была зроблена ў 1905 г. дазволам пераходаў з праваслаўя ў іншыя хрысціянскія канфесіі. Але, як паказалі наступныя гады, спакою ў край гэта не прынесла.

*Прававое вырашэнне праблемы "змешаных" шлюбаў.* Змешаныя шлюбы (шлюбы паміж сужэнцамі розных веравызнанняў) былі другім важным аспектам міжканфесійных адносін ў заходніх губернях. У канцы XVIII ст. у Расійскай імперыі адносна гэтых губерняў пачалі рабіць захады ў накірунку спалучэння традыцыйнага для далучанай тэрыторыі заканадаўства з законамі новай дзяржавы. Перш за ўсё гэта тычылася выпадкаў, калі адным з сужэнцаў быў праваслаўны. Праблема актуалізавалася ў сувязі з тым, што ў змешаныя шлюбы пачалі ўступаць рускія чыноўнікі, што прыязджалі на працу ў новыя губерні. 22 жніўня 1783 г. Сенат выдаў указ аб змешаных шлюбах, згодна з якім праваслаўныя, што ўступалі ў такі шлюб, павінны былі абавязкова звяртацца за дазволам у праваслаўную кансісторыю[15].

Нягледзячы на неаднаразовыя паўторы ўказаў аб правілах вянчання праваслаўных з хрысціянамі іншых канфесій, парушэнні адбываліся даволі часта. Дзеля папярэджання падобных парушэнняў у 1797 г. мітрапаліту ўсіх рымска-каталіцкіх цэркваў Расійскай імперыі С. Богуш-Сестранцэвічу было перададзена распараджэнне Св. Сінода, што каталіцкія і ўніяцкія святары павінны былі звязвацца з праваслаўнымі святарамі не толькі для вызначэння ступені сваяцтва будучых сужэнцаў, а і ўдакладнення часу, калі шлюбы ў праваслаўнай царкве заключаць не забаронена. Пачынаючы з 1813 г., для заключэння шлюбаў католікаў, уніятаў і лютэран з праваслаўнымі трэба было

атрымліваць дазвол праз праваслаўную кансісторыю ад мітрапаліта[16]. Пазней указам Св. Сінода (ад 22 студзеня 1840 г.) праваслаўнаму прыходскаму духавенству дазвалялася вянчаць праваслаўных з прадстаўнікамі іншых хрысціянскіх канфесій, не запытваючы кожны раз дазвол епархіяльнага кіраўніцтва. Выключэнне з правілаў складалі шлюбы "присоединенных к православию духовных лиц римской церкви, а также и евреев"[17].

У першае дзесяцігоддзе царавання Аляксандра II пытанне аб змешаных шлюбах неаднаразова падымалася ў сувязі з неабходнасцю ўрэгулявання адносін паміж Расійскай імперыяй і Рымам. У 1859 – 1860 гг. у Камітэце міністраў абмяркоўваліся магчымасці яго новага вырашэння. Вышэйшыя пецярбургскія чыноўнікі і сам імператар схіляліся да адмены абмежавальных мер мікалаеўскага заканадаўства. За прыклад бралася заключэнне шлюбаў у прысутнасці святароў абодвух веравызнанняў, як гэта рабілася ў Баварыі, Венгрыі, Рэйнскай правінцыі[18]. Але гэтыя меркаванні так і засталіся на ўзроўні праектаў.

Паўстанне 1863–1864 гг. прадэманстравала неадназначнасць узаемаадносінаў дзвюх хрысціянскіх канфесій. Заключэне шлюбаў паміж праваслаўнымі і католікамі сталі разглядацца праваслаўнымі свяшчэнна-служыцелямі, а з іх падачы і ўрадавымі коламі, як адзін з асноўных момантаў пераходаў у каталіцтва, а значыць – аслаблення пануючай царквы. З мэтай паставіць змешаныя шлюбы пад дзяржаўны кантроль 11 мая 1891 г. былі ўведзены новыя правілы іх заключэння. Цяпер заключэнне шлюбаў паміж праваслаўнымі і католікамі павінна было адбывацца толькі ў праваслаўнай царкве і пры ўмове, што каталіцкі бок прадставіў пасведчанне, выдадзенае мясцовай паліцыяй, аб сваёй "правоспособности ко вступлению в брак"[19].

Правілы не выконваліся. Католікі, што ўступалі ў шлюб з праваслаўнымі, працягвалі звяртацца да ксяндзоў за перадшлюбнымі сведчаннямі. А тыя, у свой час, ведаючы, што дзеці, народжаныя ад такога шлюбу, павінны хрысціцца па праваслаўным абрадзе, пад рознымі ўмовамі зацягвалі выдачу пасведчанняў.

Да міжканфесійных шлюбаў паміж католікамі і пратэстантамі, а таксама да веравызнання дзяцей ад такіх шлюбаў улады Расійскай імперыі ставіліся дастаткова індыферэнтна. Гэтыя шлюбы працягвалі рэгулявацца на падставе рашэнняў Варшаўскага сейму 1768 г., які і надалей знайшоў адлюстраванне ў расійскім заканадаўстве: "Шлюбы паміж асобамі замежных хрысціянскіх веравызнанняў (а не праваслаўных) у губернях Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай здзяйсняюцца святарамі той веры, да якой належыць нявеста <…>. Дзеці ў такіх шлюбах павінны быць ахрышчаны: сыны ў бацькавай, а дочкі ў той веры, якую спавядае маці"[20]. Праўда, заключаліся яны не так часта.

У непасрэднай сувязі са спробамі фарміравання новай канцэпцыі заканадаўства аб правілах заключэння міжканфесійных шлюбаў адбывалася і развіццё заканадаўчай базы па пытаннях выхавання дзяцей, народжаных ад гэтых шлюбаў. Прычым заканадаўчая база, як у першым, так і другім выпадку, развівалася на карысць пануючай царквы. У 1830 г. Дзяржаўны Савет забараніў пагадненні, згодна з якімі дзеці маглі выхоўвацца ў іншай, акрамя праваслаўнай, веры. Але ў 1834 г., у сувязі з цяжкасцямі, што ўзніклі пры рэалізацыі гэтага палажэння ў Гродзенскай і Падольскай губернях, было вызначана, што шлюбныя саюзы, заключаныя да 1832 г., лічацца правамоцнымі з пункту гледжання заканадаўчых традыцый былой Рэчы Паспалітай[21].

У далейшым заканадаўства развівалася ў накірунку замацавання імперскіх традыцый. Заканадаўчыя акты 1845 г. утрымлівалі палажэнні аб адказнасці за выхаванне дзяцей ў змешанным шлюбе не ў "христианской вере", або за далучэнне "к обрядам другого христианского вероисповедания". За падобныя парушэнні бацькі пазбаўляліся ўсіх правоў і стану і высылаліся на пасяленні, або заключаліся ў турму[22]. Правілы 1891 г. зноў падкрэслілі абавязак выхавання дзяцей у праваслаўнай веры, калі адзін з бацькоў быў праваслаўным.

Спецыфічныя адносіны скласліся ў Віцебскай губерні, дзе пражывалася вялікая колькасць стараавераў, што не прызнавалі шлюбы. Наступствамі такога сумеснага пражывання станавілася выхаванне ў стараверскіх традыцыях незаконна прыжытых дзяцей ад маці праваслаўнага веравызнання. Епархіяльнае кіраўніцтва не раз звярталася ў такіх выпадках да грамадзянскіх уладаў з патрабаваннямі прымаць рашучыя меры і забіраць дзяцей ад тых бацькоў, якія адмаўляліся хрысціць іх па праваслаўным абрадзе. Але на пачатку 1900-х гг. такія меры сталі выклікаць шмат наракканняў з боку насельніцтва. Грамадзянскія ўлады імкнуліся адхіліцца ад праблемы, адзначаючы, што падобныя акцыі патрабавалі прымянення сілы і выклікалі хваляванні сярод насельніцтва. Для вырашэння спрэчных сітуацый 12 чэрвеня 1900 г. быў прыняты указ, які прызнаў ранейшы дазвол "насильственного отобрания и передачи на воспитание родственникам или посторонним лицам православного вероисповедания…нежелательным"[23].

*Дзяржаўнае ўмяшальніцтва ва ўзаемаадносіны паміж хрысціянамі і іўдзеямі.* Даволі не проста складваліся адносіны паміж хрысціянамі і іўдзеямі, што пражывалі ў межах рысы аседласці. Царскі ўрад, не імкнучыся паглыбляцца ў гісторыю, звычаі і традыцыі яўрэйскага народа і яго рэлігію – іўдаізм, палічыў за лепшае пакінуць вырашэнне праблем кагалу. Тым не менш, на адзін з найбольш цьмяных бакоў узаемаадносінаў хрысціян і іўдзеяў – судовыя справы, звязаныя з так званымі рытуальнымі забойствамі – урад вымушаны быў звярнуць увагу.

Вялікі грамадзянскі рэзананс гэтых спраў прымусіў урад паглыбіцца ў даследаванне іх перадгісторыі. У лісце міністра народнай асветы і духоўных спраў

князя А. Галіцына да гродзенскага грамадзянскага губернатара (ад 6 сакавіка 1817 г.) адзначалася, што яшчэ ўказамі караля Жыгімонта II Аўгуста было забаронена абвінавачваць у падобных забойствах яўрэяў без усялякіх на тое падстаў. Да пытання аб выкарыстанні яўрэямі чалавечай крыві для вырабу мацы звяртаўся і папскі прастол. Але ніякіх доказаў, што пацвярджалі б гэта, не было знойдзена. У 1817 г. Аляксандр I загадаў абвясціць, каб "впредь евреи не были обвиняемы в умерщвлении христианских детей без всяких улик по единому предрассудку, что якобы они имеют нужду в христианской крови"[24]. Тым не менш, абвінавачванні працягваліся. Так, па сведчанні віленскага губернатара К. Палена кожную вясну перад Вялікаднём паліцыя Віленскай губерні была завалена заявамі аб крадзяжах яўрэямі хрысціянскіх дзяцей, але ніводны выпадак так і не пацвердзіўся[25].

Гэтыя сярэдневяковыя, нават дзікія для XIX – пач. XX ст. абвінавачванні, мелі пад сабой грунт. Варожыя міжканфесійныя адносіны – хрысціяне/іўдзеі – праяўляліся не толькі ў народных масах, а былі ўласцівыя адукаваным колам хрысціянскага грамадства, у тым ліку і духавенству. Яны грунтаваліся на выкрыцці "вредных учений" іўдаізма, аб чым даволі часта пісалася ў тагачасных сродках масавай інфармацыі. У якасці іншага фактара, што рыхтаваў глебу для падобных адносінаў, вылучаецца шырокі ўдзел яўрэяў у кіраванні фінансавай і гаспадарчай дзейнасцю.

Такім чынам, з далучэннем зямель ВКЛ і Правабярэжнай Украіны, характэрнай рысай якіх з'яўлялася поліканфесійнасць, урад Расійскай імперыі пачаў ствараць заканадаўчую базу для рэгулявання адносінаў паміж рознымі канфесіямі гэтай тэрыторыі. Выпрацоўка сістэмы заканадаўчых мер у накірунку рэгулявання міжканфесійных адносінаў на працягу ўсяго перыяду будавалася на дзяржаўных прыярытэтах: а) захаванне пануючага становішча праваслаўнай царквы, б) абмежаванне духоўнай дзейнасці неправаслаўных канфесій.

1 Линкевич В.Н. Межконфессиональные отношения в Беларуси (1861–1914 гг.) – Гродно, 2008; Морунов А.А. Межконфессиональные отношения в Беларуси XIV – начала XXI вв.: Автореф. … канд. ист. наук, 07.00.07 – этнография, этнология и антропология. – Минск, 2011.
2 Горючко П. Из истории возсоединения униатов в Белоруссии. 1795–1805 гг. – Киев, 1902. – С. 42.
3 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у С.-Пецярбургу (далей – РДГА у С.-Пецярбургу). – Ф. 797. – Воп. 2. – Спр. 5445. – Арк. 1, 2.
4 Нацыянальны гістарычны архіў (далей – НГАБ). – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 545, 691, 1222.
5 Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. – Вильна, 1889. – Т. 16. – С. CVII, CIX.
6 Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. – Мінск, 2002. – С. 16.
7 Гістарычны архиў Літвы (далей – ГА Літвы). – Ф. 378 а/а. 1845. – Спр. 70. – Арк. 1, 1 адв.
8 Отечественная церковь по статистическим данным с 1840–1841 по 1890–1891 гг. – СПб., 1897. – С. 51.

9 РДГА. – Ф.821. – Воп. 150. – Спр. 801. – Арк. 4.
10 НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45855. – Арк. 6.
11 Тамсама. – Арк. 8 адв.
12 Тамасама. – Арк. 27.
13 РДГА. – Ф. 1269. – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 48.
14 Цыт. па: Герасимова И.П. Обращение евреев в христианство и Русская православная церковь (на примере крещения евреев из Белоруссии в Казанской епархии в середине XIX в.) // Кафоликия. – Вып. 3. – 2009. – С. 58.
15 Климов Н.Ф. Постановление по делам православной церкви и духовенства в царствование императрицы Екатерины II: Вып. 1. – СПб, 1902. – С. 80, 81.
16 Анофранка Н.В. Жанчыны дваранскага саслоўя Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.: сацыяльна-прававы статус, удзел у грамадскім жыцці: Дыс…. канд. гіст. навук . – Мінск, 2012. – С. 47.
17 НГАБ. – Ф. 2617. – Воп. 1. – Спр. 392. – Арк. 2.
18 Горизонтов Л.Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше. – М., 1999. – С. 83.
19 Табунов В.В. Борьба за влияние на население белорусских земель между церковью и костелом посредством межконфессиональных браков конце XIX – начале XX вв. // Актуальные проблемы современного гуманитарного познания. – Витебск, 2009. – С. 164.
20 Цыт. па: Анофранка Н.В. Жанчыны дваранскага саслоўя Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.: сацыяльна-прававы статус, удзел у грамадскім жыцці. – С. 50.
21 Тамсама. – С. 79.
22 Развитие русского права в первой половине XIX века. – М., 1994. – С. 171.
23 НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 44230. – Арк. 18.
24 Цыт. па: Филатова Е.Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. – С. 120.
25 Тихонов А.К. Католики, мусульмане и иудеи Российской империи в последней четверти XVIII – начале XX в. – СПб., 2008. – С. 265.

## Summary

**Alena Filatava, Valiantsina Yanouskaya**

**Regulations of inter confessional relations in the Western provinces of the Russian Empire(the end of the 18 th –beginning of the 20 th century)**

With the annexation of lands of the former Grand Duchy of Lithuania and of the Right-Bank Ukraine, which were multiconfessional territories, the government of the Russian Empire began to develop legal framework for regulation of relations between different confessions. The principles for these regulatory measures during the end of the 18th – beginning of the 20th century period are based on the following priorities: a) to maintain the dominant position of the Orthodox Church, and b) to restrict activities of non-Orthodox denominations.

*Keywords:* Russian Empire, Western provinces, interconfessional relations, legal framework